# 2012 ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ - БЕЛАРУСЬ

## УСТОЙЛІВАСЦЬ АГС: 5.8

Ціск на арганізацыі грамадзянскай супольнасці (АГС) Беларусі ў 2012 годзе зменшыўся ў параўнанні з папярэднім годам. Грамадскія актывісты зазналі менш перасьлед, у тым ліку што тычыцца вобшукаў і адміністратыўных затрыманняў. Цягам года АГС здолелі арганізаваць шэраг значных публічных мерапрыемстваў, хаця ўлады часам адмаўлялі ў прадастаўленні памяшканняў для кангрэсаў, канферэнцый, сходаў, фестываляў.

**2012 Балы для Беларусі**




У 2012 годзе намаганні АГС па адвакатаванні, лабіяванні і ўдзелу ў публічнай палітыцы сталіся вынікам павышэння вядомасці важных сацыяльных пытанняў на нацыянальным узроўні, а ў некаторых выпадках прывялі да прыняцця спрыяльнага заканадаўства. АГС больш факусаваліся на дасягненні прызнання з боку грамадскасці і адпаведна больш кантактавалі са сваімі мэтавымі групамі, стваралі ўласныя прэсавыя службы і былі больш актыўныя ў інтэрнэце, у тым ліку ў сацыяльных сетках. Быў запушчаны інавацыйны, рынкава-арыентаваны механізм, які забяспечвае празрыстае ўзаемадзеянне кансультантаў у сферы арганізацыйнага развіцця і АГС. Імкнучыся павысіць устойлівасць сваіх паслугаў, АГС мэтанакіравана прыцягвалі мясцовыя рэсурсы, у тым ліку сяброўскія ўнёскі.






Паводле звестак на 31 снежня 2012 года, у краіне налічваліся 2,477 зарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку 229 міжнародных, 688 рэспубліканскіх і 1,560 мясцовых; 31 саюз (асацыяцыя) грамадскіх аб'яднанняў; 139 фондаў. У 2012 годзе было зарэгістравана 111 новых грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку 2

міжнародныя, 10 рэспубліканскіх і 99 мясцовых. Прыкладна палова новых арганізацый (51%) маюць спартовы накірунак дзейнасці; ніводнай жаночай і праваабарончай арганізацыі не было зарэгістравана ў 2012 годзе.

## ПРАВАВЫ АСЯРОДАК: 6.8




Дзейнае заканадаўства і ягоная практыка стрымліваюць развіццё АГС у Беларусі. Нязначная колькасць экспертаў, пераважна ў сталіцы, аказваюць кваліфікаваную юрыдычную дапамогу АГС.

Каб зарэгістравацца, АГС мусяць атрымліваць дазвол ад дзяржавы. Працэс рэгістрацыі застаецца складаным і дарагім у параўнанні з камерцыйнымі арганізацыямі. Рашэнне аб рэгістрацыі ці нерэгістрацыі АГС прымаецца цягам месяца, аднак, калі патрабуецца дадатковая інфармацыя, працэдура можа зацягнуцца. Рэгістрацыйны ўнёсак складае каля 60 даляраў для мясцовых і 115 даляраў для нацыянальных АГС. Онлайн рэгістрацыя АГС не прадугледжаная.

Існуе шырокі набор падставаў, паводле якіх улады могуць адмовіць у рэгістрацыі ці ліквідаваць АГС. Па-ранейшаму прадугледжана крымінальная адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі; паводле гэтага артыкула ў 2012 годзе некалькі сябраў незарэгістраваных ініцыятываў атрымалі вусныя ці пісьмовыя папярэджанні.

Прымаючы да ўліку складанасці з рэгістрацыяй, некаторыя АГС лічаць за лепшае атрымліваць легальны статус у форме некамерцыйных установаў, якія больш танныя паводле выдаткаў і могуць быць заснаваныя адным чалавекам на аснове паведамляльнага прынцыпу. АГС таксама працягваюць практыку рэгістрацыі за мяжой, перадусім у суседніх Літве і Польшчы.

У 2012 годзе некаторыя АГС былі ліквідаваныя за парушэнне заканадаўства. Да прыкладу, інфармацыйна-асветніцкая ўстанова “Платформа”, якая абараняла правы зняволеных, была пазбаўленая рэгістрацыі за хібы ў падатковай справаздачнасці.

Заканадаўства стрымлівае дзейнасць АГС. Замежнае фінансаванне і ананімныя ахвяраванні застаюцца прадметам абавязковай рэгістрацыі з боку ўладаў, якія ў тым ліку патрабуюць лісты падтрымкі ад профільных дзяржаўных установаў. АГС мусяць мець юрыдычны адрас у нежылым памяшканні, што каштуе даволі дорага. Савет Міністраў зацвярджае адмысловы спіс, які ўключае звыш 400 некамерцыйных арганізацый, якія маюць ільготу на арэнду сваіх офісаў у дзяржаўных будынках. Аднак адсутнічаюць зразумелыя крытэрыі, паводле якіх магчыма трапіць у гэты спіс.

Рэпрэсіі ў дачыненні АГС і іх сябраў зменшыліся ў параўнанні з 2011 годам. Аднак назіраецца тэндэнцыя ціску на асобных актывістаў праз падатковыя працэдуры. Так, дэкляраваць прыбыткі за некалькі год мусіла кіраўніцтва такіх арганізацый, як ГА “Экадом”, РПГА “Беларускі Хельсінкскі Камітэт”, Беларускі Інстытут Стратэгічных Даследаванняў, Праваабарончы цэнтр “Вясна”. Непалітычныя актывісты, у тым ліку праваабаронцы, эколагі і незалежныя аналітыкі, траплялі пад адміністратыўную адказнасць і сплочвалі штрафы. У папярэднія гады падобныя санкцыі назіраліся перадусім у дачыненні палітычных дзеячоў.

У 2012 годзе некаторыя актывісты, да прыкладу, лідэры ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” і РПГА “Беларускі Хельсінкскі Камітэт”, былі часова пазбаўлены права пакідаць краіну. Алесь Бяляцкі,

кіраўнік Праваабарончага цэнтра “Вясна”, дагэтуль знаходзіцца ў турме; па ягонай справе беларускія ўлады адмовіліся ад супрацоўніцтва з камісіяй ААН па правах чалавека.

Улады вызначаюць у кожным канкрэтным выпадку, ці вызваляецца замежная дапамога ад падаткаў. Замежныя і мясцовыя донары – як інстытуцыі, так і індывідуальныя прадпрымальнікі – маюць права падтрымліваць толькі канкрэтныя сферы, пералічаныя ў афіцыйных актах. Палёгку ад падаткаў маюць толькі тыя дабрачынцы, якія ахвяруюць на спартовыя арганізацыі ці на людзей з абмежаваннямі. АГС не маюць права займацца гаспадарчай дзейнасцю.

З пазітыўных зменаў, у чэрвені 2012 года былі прынятыя папраўкі ў Закон “Аб сацыяльным абслугоўванні”, які ўвайшоў у сілу 1 студзеня 2013 года і дазволіў дзяржаве замаўляць сацыяльныя паслугі ад АГС. Гэтыя папраўкі былі зробленыя пры непасрэдным спрыянні АГС.

## АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ: 5.1




АГС плануюць сваю дзейнасць з улікам актыўнага ўцягнення мэтавых групаў, як выконваючы патрабаванні донара, так і разумеючы перавагі ўдзелу супольнасцей. Да прыкладу, АГС актыўна працавалі са сваімі мэтавымі групамі, каб развіць веласіпедную інфраструктуру ў Гродна і Брэсце; прыцягвалі мясцовых жыхароў, каб супрацьстаяць ушчыльненню забудовы ў Мінску, пабудове новых індустрыяльных аб’ектаў у Смалявічах і Светлагорску, знішчэнню дрэваў у жылых зонах.

Многія АГС базуюць сваю дзейнасць і прыняцце рашэнняў на стратэгічных планах. Усё больш АГС разглядаюць стратэгічнае планаванне не проста як даніну модзе, але як працоўны інструмент, які спрыяе дасягненню большых вынікаў. Рэгіянальныя АГС, аднак, яшчэ зрэдку інкарпаруюць стратэгічнае планаванне ў сваю дзейнасць, і толькі адзінкі з іх маюць добра сфармуляваныя місіі і распрацаваныя стратэгічныя планы.

Усё больш АГС пачынаюць разумець важнасць развіцця сістэм унутранай дэмакратыі, што тычыцца падзелу ўладаў, прыняцця групавых рашэнняў і арганізацыйнай празрыстасці. Некаторыя АГС падзяляюць адказнасць кіруючага і выканаўчага органаў, але толькі на паперы. У многіх АГС адны і тыя ж людзі працягваюць працаваць і ў назіральнай радзе, і ў штаце арганізацыі.

Лічаныя АГС маюць палітыку працы з людзьмі ў арганізацыі, у тым ліку кантракты, прапісаныя пасадавыя абавязкі ці кадравую палітыку. Большасць АГС не маюць сродкаў, каб утрымліваць персанал і забяспечваць яго мінімальным сацыяльным пакетам, да прыкладу, аплочваць адпачынак ці бальнічны, афармляць працоўныя кніжкі. Частка АГС сутыкаюцца з праблемай прыцягнення і ўтрымання валанцёраў, што часта звязана з недахопам адпаведнай кваліфікацыі персанала і сябраў.

Большасць АГС узмацнілі свае тэхнічныя базы за кошт персанальных рэсурсаў сваіх сябраў і донарскай падтрымкі, таму яны маюць неабходнае абсталяванне для сваёй дзейнасці. Аднак, паранейшаму АГС не маюць сродкаў на набыццё ліцэнзійных кампутарных праграмаў.

## ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ: 6.5

У 2012 годзе беларускія АГС пачалі шукаць шляхі, каб пашырыць долю мясцовых рэсурсаў у сваіх бюджэтах. Многія арганізацыі збіраюць сяброўскія ўнёскі, памер якіх у некаторых выпадках павялічыўся, каб была магчымасць пакрыць арганізацыйныя выдаткі. Міжнародны сацыяльна-




эканамічны Фонд "Ідэя" папулярызуе карпаратыўную сацыяльную адказнасць сярод сярэдняга і буйнога бізнесу.

Частка арганізацый, такіх як ГА "Беларускае таварыства абароны спажыўцоў" і некаторыя спартовыя арганізацыі, паводле закону, маюць права мець прыбытак. Аднак большасць АГС вымушаны ўтвараць камерцыйныя арганізацыі, каб мець магчымасць зарабляць легальна, хаця гэта ўскладняе іх менеджэрскія структуры і падатковае абкладанне. Да прыкладу, ГА "Адукацыйны цэнтр "ПОСТ" зарэгістраваў інфармацыйна-кансультацыйную ўстанову, каб мець магчымасць атрымліваць легальна плату за паслугі. Некаторыя рэлігійныя арганізацыі маюць уласную вытворчасць, частка прыбытку ад якой ідзе на сацыяльныя праграмы. Іншыя АГС легалізуюць прыбытак ад сваіх паслугаў, афармляючы яго як сяброўскія ўнёскі ці ахвяраванні.

Заканадаўства, якое дазваляе дзяржаве закупаць паслугі АГС, пакуль не мае пашырэння. Тым не менш, мясцовыя ўлады ў васьмі рэгёнах краіны правялі пілотныя конкурсы і прафінансавалі праекты АГС па прафілактыцы ВІЧ.

Нягледзячы на спробы дыверсіфікацыі рэсурсаў, замежнае фінансаванне па-ранейшаму застаецца асноўнай крыніцай падтрымкі беларускіх АГС. АГС павінны рэгістраваць замежную дапамогу. У 2012 годзе Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці Упраўлення справамі Прэзідэнта адмовіў у рэгістрацыі некаторым праектам АГС у сферы адукацыі, сацыяльных паслугаў і мясцовага развіцця з прычыны іх "нямэтазгоднасці"; фінансаванне для праектаў мусіла ісці ад донарскіх арганізацый ЗША, Нямеччыны і Швецыі. У некаторых выпадках не рэгіструюцца нават тыя праекты, якія адпавядаюць дзяржаўным прыярытэтам і падтрымліваюцца чыноўнікамі. Да прыкладу, праект Асацыяцыі дадатковай адукацыі і асветы не быў зарэгістраваны, нягледзячы на тое, што меў падтрымку ад профільнай дэпутацкай камісіі і мясцовых уладаў.

АГС, якія існуюць ужо працяглы час, маюць сістэмы фінансавага менеджменту, гэтаксама як высока кваліфікаваных бухгалтараў і спецыялізаваныя кампутарныя праграмы. Аднак, праз складаны прававы кантэкст АГС вымушаны карыстацца паўлегальнамі схемамі, што значна зніжае фінансавую празрыстаць сектара ў цэлым. Толькі адзінкавыя АГС могуць дазволіць сабе незалежны аўдыт; пры гэтым знешні аўдыт праводзіцца толькі ў тых выпадках, калі гэтага патрабуе донар.

## АДВАКАТАВАННЕ: 5.7




У 2012 годзе АГС інтэнсіфікавалі сваю адвакатыўную дзейнасць, якая прывяла да павышэння публічнай увагі да шэрагу значных сацыяльных пытанняў.

Улады шчыльна супрацоўнічаць з тымі незалежнымі АГС, якія могуць забяспечыць іх доступам да інфармацыі, кантактаў і знешніх інвестыцый. АГС працягваюць удзельнічаць у грамадскіх Радах па аграэкатурызму, устойліваму развіццю, сацыяльных пытаннях і развіццю

кандамінімумаў. Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы акаляючага асяродку перыядычна абвяшчае конкурсы праектаў на экалагічную тэматыку. У 2012 годзе дзевяць АГС сталі сябрамі працоўнай групы па абмеркаванні Воднага Кодэкса Рэспублікі Беларусь.

У 2012 годзе АГС ініцыявалі і працягнулі шматлікія адвакатыўныя захады ў розных публічных сферах. Да прыкладу, АГС прасунулі папраўкі ў паляўнічае заканадаўства; рэалізавалі кампанію супраць катаванняў; узнялі на ўзровень публічнага абмеркавання пытанні безбар'ернага асяродку для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Кампанія "Будзьма беларусамі!" спрычынілася да таго, што баскетбольны клуб "Мінск-2006" быў перайменаваны ў "Цмокі-Мінск" у гонар міфічнага персанажа з нацыянальнага фальклору. Кампанія салідарнасці з палітычнымі вязнямі была арганізаваная з нагоды 50-й гадавіны з дня нараджэння праваабаронца Алеся Бяляцкага, які з 2011 года знаходзіцца ў турме.

АГС шырока выкарыстоўваюць інтэрнет у адвакатаванні. Да прыкладу, кампанія "Справаводства па-беларуску", маючы значную онлайн падтрымку ў сацыяльных медыя, дамагаецца, каб дзяржаўныя і іншыя ўстановы вялі справаводства і адказвалі на запыты грамадзян па-беларуску.

Дзякуючы намаганням АГС і партнёрскіх арганізацый, афіцыйны Мінск не зможа да 2015 года ўключыць Беларусь у Балонскі працэс згодна з еўрапейскімі ўніфікаванымі адукацыйнымі стандартамі, пакольні пакуль не здольны забяспечыць акадэмічныя свабоды і абараніць студэнтаў ад рэпрэсій. У той жа час асветніцкая ўстанова "Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый" разам з шэрагам іншых АГС і дзяржаўных установаў дапамагае падрыхтавацца да паўнавартаснага ўключэння Беларусі ў Балонскі працэс.

АГС таксама здолелі паўплываць на заканадаўчы працэс. Адвакатыўныя намаганні МАГА "АКТ" і іншых сацыяльна арыентаваных арганізацый сталіся прычынай прыняцця зменаў у Закон "Аб сацыяльным абслугоўванні", які дазволіў дзяржаве закупаць сацыяльныя паслугі ў АГС. АГС актыўна запрашаюцца да ўдзелу ў распрацоўцы стратэгій устойлівага развіцця; каля дваццаці такіх стратэгій – вядомых як Мясцовыя Павесткі 21 – былі прадстаўлены грамадскасці.

Нягледзячы на пазітыўныя зрухі, шмат АГС, асабліва на мясцовым узроўні, яшчэ не гатовы займацца адвакатаваннем, таму што, з аднаго боку, яны не бачаць сваёй ролі ў публічнай палітыцы, а з іншага – засцерагаюцца пераследу ўладаў.

## АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ: 5.4




АГС аказваюць шырокі спектр паслугаў у розных сферах, у тым ліку аздараўленчыя, сацыяльныя, інфармацыйныя, навучальныя і кансультацыйныя сервісы для насельніцтва, дзяржаўных установаў і іншых АГС. Новыя паслугі развіваюцца ў такіх галінах, як папулярызацыя камп'ютарных тэхналогій, інфармацыйная бяспека, энергетычная эфектыўнасць, экалагічна бяспечныя матэрыялы, адукацыя для дарослых, у тым ліку праз новыя формы дыстанцыйнага навучання. АГС ствараюць друкаваныя і электронныя выданні. Так, часопіс Цэнтра прававой трансфармацыі "Lawtrend Monitor" размяшчае спецыялізаваную юрыдычную інфармацыю; бюлетэнь "Вместе" Асацыяцыі "БелСетка антыСНІД" асвятляе падзеі ў галіне прафілактыцы ВІЧ. У той час, як колькасць паслугаў ад АГС стала расце, іх якасць і аб'ём застаюцца нізкімі і не ахопліваюць усе рэгіёны краіны.

Шмат арганізацый грунтуюць сваю дзейнасць на аналізе патрэбаў мэтавых групаў і супольнасцей. Паводле вынікаў маніторынгу Альтэрнатыўнай моладзевай платформы, усё большая колькасць моладзевых арганізацый пачынаюць ацэньваць эфектыўнасць сваіх паслугаў, вывучаць патрэбы мэтавых групаў, у тым ліку ўключаць іх у працэс планавання.

Пераважная большасць АГС разлічваюць на падтрымку сваіх паслугаў з боку донараў, што ставіць пад сумнеў устойлівасць такіх паслугаў. Каб кампенсаваць кошт паслугаў, рэлігійныя арганізацыі актыўна збіраюць дабрачынныя ахвяраванні, АГС – сяброўскія ўнёскі, а таксама зрэдку прыцягваюць для гэтых мэтаў дзяржаўныя сродкі. Да прыкладу, РГА “Беларуская Асацыяцыя клубаў ЮНЕСКО” рэгулярна атрымлівае фінансаванне ад дзяржавы на арганізацыю спецыялізаваных аздараўленчых летнікаў. Аднак на сённяшні момант толькі 16 арганізацый уключаны ў Рэспубліканскі рэестр моладзевых і дзіцячых аб’яднанняў, якія карыстаюцца дзяржаўнай падтрымкай.

У 2012 годзе некамерцыйная ўстанова “Бюро арганізацыйнага кансалтынгу” апублікавала першае ў краіне даследаванне, якое закранула пытанне фармавання кошту паслугаў арганізацыйнага развіцця для АГС.

## ІНФРАСТРУКТУРА: 5.3




АГС прадастаўляюць як традыцыйныя сервісы інфармацыйных і рэсурсовых цэнтраў, так выконваюць і шырэйшыя функцыі. Патрэбы АГС у падтрымцы змяніліся. Так, экспертыза беларускіх аналітычных цэнтраў становіцца ўсё больш запатрабаванай: АГС карыстаюцца іх сервісамі пры падрыхтоўцы праектных прапановаў і аналітычных публікацый; міжнародныя арганізацыі і праграмы – пры пераглядзе прыярытэтаў сваёй падтрымкі і распрацоўцы тэхнічных інтэрвенцый; дзяржава – каб лепш зразумець трэнды трэцяга сектара.

АГС па-ранейшаму маюць неабходнасць у паслугах арганізацыйнага развіцця. Існуе шэраг арганізацый, якія прадастаўляюць такія паслугі, маюць высока кваліфікаваных трэнераў і адукацыйныя матэрыялы на беларускай і рускай мовах. Праграмы дыстанцыйнага навучання ўсё больш набываюць папулярнасць сярод прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, паколькі доступ ў інтэрнет стала паляпшаецца. У 2012 годзе шэраг буйных беларускіх АГС запусцілі Біржу арганізацыйнага развіцця – механізм, які дазваляе забяспечыць празрыстае ўзаемадзеянне паміж кансультантамі і АГС і часткова пакрывае выдаткі арганізацый на паслугі арганізацыйнага развіцця.

Сеткавыя ўтварэнні АГС – да прыкладу, Таварыства “Зялёная Сетка”, Альтэрнатыўная моладзевая платформа, Асацыяцыя дадатковай адукацыі і асветы, Асацыяцыя “БелСетка антыСНІД”, Міжнародны кансорцыум “ЕўраБеларусь” – грунтуюцца перадусім на тэматычнай тоеснасці і прадастаўляюць інфармацыйную, трэнінгавую і адвакатыўную падтрымку іншым АГС. Нацыянальная платформа Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга Партнёрства аб’ядноўвае каля 60 арганізацый, аднак намаганні па кансалідацыі Платформы ўскладнены наяўнасцю ўнутраных супярэчнасцей, а таксама нізкім узроўнем поспеху ранейшых спробаў кансалідацыі ўнутры сектара.

Колькасць арганізацый у Беларусі, якія займаюцца рэгрантынгам замежных сродкаў, узрастае. Да прыкладу, Міжнародны кансорцыум “ЕўраБеларусь” размяркоўвае рэсурсы Форума Syd (Швецыя); АГА “Фонд імя Льва Сапегі” – еўрапейскай Асацыяцыі агенцый мясцовай дэмакратыі ALDA. Гэтая практыка, аднак, не з’яўляецца цалкам празрыстай. За рэдкім выключэннем, АГС не справаздачацца па

фінансававай дзейнасці, каб пазбегнуць праблем са строгімі працэдурамі рэгістрацыі грантаў і ахвяраванняў.

АГС працуюць з дзяржавай праз нацыянальныя і рэгіянальныя Рады. Эфектыўнасць такіх Радаў залежыць ад прысутнасці там дасведчаных АГС і ўзроўню даверу паміж асобнымі чыноўнікамі і грамадскімі актывістамі. Супрацоўніцтва паміж АГС і бізнесам развіваецца дзякуючы Глабальнай дамове Праграмы развіцця ААН, якая прасоўвае сацыяльную адказнасць бізнесу. Часам камерцыйныя кампаніі арганізуюць дабрачынныя праграмы праз АГС, да прыкладу, кампанія Coca-Cola ў Беларусі праз супрацу з Беларускай Асацыяцыяй клубаў ЮНЕСКО фінансуе аўтаралі ў падтрымку прафілактыкі ВІЧ сярод падлеткаў.

## ГРАМАДСКІ ІМІДЖ: 5.9




Грамадскі імідж АГС не палепшыўся. Большасць грамадзян не разумеюць тэрмін “грамадзянская супольнасць” і не ўсведамляюць ролю сектара ў развіцці краіны.

Медыя асвятляюць дзейнасць АГС часта ў палітызаваным рэчышчы. Дзяржаўныя выданні перыядычна абвінавачваюць грамадзянскую супольнасць ў фінансаванні з боку заходніх донараў, што адкладае негатыўны адбітак на імідж сектара ў цэлым.

У 2012 годзе асвятленне ў СМІ асобных пытанняў дзейнасці АГС, такіх як экалогія і падтрымка людзей з абмежаванымі магчымасцямі, палепшылася. Аднак, за выключэннем асобных выданняў, накшталт Еўрарадыё з яго асобнай рубрыкай, прысвечанай АГС, медыя не маюць жадання і магчымасцей даваць грунтоўныя матэрыялы па дзейнасці грамадзянскай супольнасці – іх камунікацыі з АГС слабыя, а навіны пра АГС не маюць высокай запатрабаванасці ў грамадстве.

АГС спрабуюць інтэнсіфікаваць свае дачыненні з грамадскасцю, каб пераадолець негатыўны імідж. Многія буйныя арганізацыя маюць цяпер у штаце спецыялістаў, адказных за сувязі з грамадскасцю і СМІ. Адмыслова арганізаваныя прэс-службы АГС самастойна асвятляюць падзеі ў сектары, да прыкладу, падчас Кірмашу арганізацыйнага развіцця, Фестывалю нефармальнай адукацыі, канферэнцыі Нацыяльнай платформы ФГС УП. АГС актыўна развіваюць свае онлайн пляцоўкі, рассылкі і ўсё больш выкарыстоўваюць сацыяльныя медыя. Вебсайты некаторых арганізацый працуюць у рэжыме ўласных медыя, да прыкладу, EuroBelarus.info Міжнароднага кансорцыума “ЕўраБеларусь” і AMPby.org Альтэрнатыўнай моладзевай платформы.

Успрыманне АГС з боку ўладаў не змянілася ў 2012 годзе. Урад па-ранейшаму ставіцца з насцярожанасцю да пэўных арганізацый, перадусім праваабарончага кшталту, хаця некаторыя дзяржаўныя ўстановы ўзаемадзейнічаюць з АГС па канкрэтных працоўных пытаннях. Да прыкладу, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы акаляючага асяродку шчыльна працуе з экалагічнымі АГС, Міністэрства аховы здароўя – з ВІЧ-сэрвіснымі АГС. Што тычыцца бізнесу, збольшага ён не разумее сутнасць і ролю грамадзянскай супольнасці.

Беларускія АГС як сектар не маюць распрацаванага этычнага кодэкса. АГС зрэдку публікуюць штогадовыя справаздачы аб сваёй дзейнасці, паколькі грамадскасць гэтага не патрабуе. Адзінкавыя АГС робяць публічныя справаздачы, але зноў жа без прадастаўлення поўнай фінансавай інфармацыі.

Індэкс устойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГСІУ) з'яўляецца ключавым інструментам вымярэння прагрэсу грамадскага сектара ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе і Еўразіі (E&E рэгіён). Індэкс адсочвае прагрэс грамадскага сектара ў 29 краінах цягам апошніх пятнаццаці год. Індэкс вывучае агулам варункі, якія спрыяюць развіццю грамадзянскай супольнасці, з фокусам на прававы асяродак для дзейнасці няўрадавых арганізацый, арганізацыйнае развіццё, фінансавую ўстойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслугаў, інфраструктуру і грамадскі імідж. Кожнае вымярэнне рэйтынгуецца паводле сямібальнай шкалы, дзе 1 паказвае на вельмі прагрэсіўны ўзровень, а 7 – на нізкі ўзровень развіцця. Індэкс распрацаваны Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці ў партнёрстве з мясцовымі арганізацыямі ў кожнай з тых краін, дзе вымяраецца Індэкс.

Для атрымання падрабязнай інфармацыі, калі ласка, звяртайцеся ў Міжнароднае асветніцкае грамадскае аб'яднанне "АКТ", actngo.info@gmail.com

Англійская версія Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці 2012 для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі даступная для азнаямлення па спасылцы: http://www.usaid.gov/europe-eurasia-civil-society